# КОСМАС ГАВОРЫЦЬ ПА-РУСКУ

14 студзеня 1969 года, у 10 гадзін 39 мінут маскоўскага часу на арбіту штучнага спадарожніка Зямлі магутнай ракетай-носьбітам выведзен касмічны карабель «Саюз-4».

Касмічны карабель пілатуе грамадзянін Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт падпалкоўнік ШАТАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч.

Параметры арбіты касмічнага карабля «Саюз-4» блізкія да разліковых і складаюць:

перыяд абарачэння вакол Зямлі 88,25 мінуты;
максімальнае аддаленне ад паверхні Зямлі (у апагеі) — 225 кіламетраў;
мінімальнае аддаленне ад паверхні Зямлі (у перыгеі) — 172 кіламетры;
нахіл арбіты — 51 градус 40 мінут.

З касмічным караблём «Саюз-4» устаноўлена надзейная двухбаковая радыёсувязь. Паведамленні з борта карабля перадаюцца на частотах 20,008 мегагерц.

Па дакладу лётчыка-касманаўта таварыша Шаталава Уладзіміра Аляксандравіча і даных тэлеметрычных вымярэнняў стан яго выдатны.

Бартавыя сістэмы карабля «Саюз-4» функцыяніруюць нармальна і падтрымліваюць ціск і тэмпературу ў зададзеных межах.

* * *

15 студзеня 1969 года, у 10 гадзін 14 мінут маскоўскага часу на арбіту спадарожніка Зямлі выведзен касмічны карабель «Саюз-5» з экіпажам з трох касманаўтаў.

На борце касмічнага карабля знаходзяцца савецкія лётчыкі-касманаўты: камандзір карабля падпалкоўнік ВАЛЫНАЎ Барыс Валянцінавіч і члены экіпажа — бортінжынер, кандыдат тэхнічных навук ЕЛІСЕЕЎ Аляксей Станіслававіч і інжынер-даследчык падпалкоўнік ХРУНОЎ Яўген Васільевіч.

Касмічны карабель «Саюз-5» выведзен на разліковую арбіту.

Параметры арбіты касмічнага карабля «Саюз-5» складаюць:

перыяд абарачэння вакол Зямлі — 88,7 мінуты;
максімальнае аддаленне ад паверхні Зямлі (у апагеі) — 230 кіламетраў;
мінімальнае аддаленне ад паверхні Зямлі (у перыгеі) — 200 кіламетраў;
нахіл арбіты — 51 градус 40 мінут.

Пасля вывядзення на арбіту камандзір карабля «Саюз-5» тав. Валынаў Барыс Валянцінавіч устанавіў двухбаковую радыёсувязь з Зямлёй і касмічным караблём «Саюз-4».

Па дакладу таварыша Валынава Б. В., стан здароўя яго і членаў экіпажа добры; ціск і тэмпература ў адсеках карабля нармальныя.

Камандзіры караблёў «Саюз-4» і «Саюз-5» лётчыкі-касманаўты таварышы Шаталаў Уладзімір Аляксандравіч і Валынаў Барыс Валянцінавіч далажылі, што пачалі выкананне праграмы сумесных эксперыментаў у касмічнай прасторы.

* * *

На 9 гадзін маскоўскага часу 16 студзеня касмічныя караблі «Саюз-4» і «Саюз-5» зрабілі адпаведна 32 і 15 абаротаў вакол Зямлі.

Камандзір касмічнага карабля «Саюз-4» У. А. Шаталаў на 31 вітку праводзіў медыцынскія даследаванні, наглядаў за часцінкамі, якія свяціліся.

На 32 вітку пасля арыентацыі касмічнага карабля «Саюз-4» з дапамогай ручной сістэмы кіравання была ўключана рухальная ўстаноўка, і карабель перайшоў на новую арбіту з параметрамі:

— перыяд абарачэння вакол Зямлі 88,85 мінуты;
— максімальная адлегласць ад паверхні Зямлі (у апагеі) — 253 кіламетры;
— мінімальная адлегласць ад паверхні Зямлі (у перыгеі) — 201 кіламетр;
— нахіленне арбіты 51 градус 40 мінут.

У гэты час згодна з праграмай экіпаж касмічнага карабля «Саюз-5», кіруемы камандзірам карабля Б. В. Валынавым, выконваў комплекс запланаваных эксперыментаў і навуковых даследаванняў.

Бортінжынер А. С. Елісееў працягваў весці назіранні за геолага-геаграфічнымі аб'ектамі зямной паверхні, нябеснымі свяціламі і праводзіў навігацыйныя вымярэнні.

Інжынер-даследчык Я. В. Хруноў выконваў медыцынскія даследаванні, вывучаў прахаджэнне радыёхваль праз іёнасферу.

Камандзіры касмічных караблёў далажылі, што самаадчуванне ўсіх касманаўтаў выдатнае, бартавыя сістэмы караблёў працуюць нармальна.

Палёт касмічных караблёў паспяхова працягваецца.

(ТАСС).

## ДА ХУТКАЙ СУСТРЭЧЫ!

Зноў савецкі чалавек у Космасе!

Пачуццё велізарнага хвалявання выклікае кожнае паведамленне ў студэнтаў факультэта журналістыкі. З гонарам паўтараем мы новыя імёны савецкіх касманаўтаў, з нецярпеннем чакаем кожны рэпартаж з Космасу. Хваляванні, радасць не пакідаюць сэрца кожнага з нас.

Радасную вестку многія пачулі ў час здачы экзаменаў. Можа таму і адказы ва ўсіх толькі добрыя і выдатныя. Поспехі ў Космасе натхняюць на поспехі ў вучобе.

Хочацца пажадаць касманаўтам выдатнага выканання палёту, шчаслівага вяртання на Зямлю.

Да хуткай сустрэчы!

**Л. БУРАЧЭЎСКАЯ,**
**А. ШКАБАРЫНА,**
студэнткі другога курса факультэта журналістыкі.


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 2 (731) ● Пятніца, 17 студзеня 1969 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII


## СЕСІЯ Ў РАЗГАРЫ

**● Весткі з факультэтаў ● Большасць адзнак — выдатныя ● У кабінеце палітэканоміі дбаюць аб студэнтах ● Здымкі расказваюць ● І прафілакторый жыве сесіяй.**

## ІДУЦЬ ЭКЗАМЕНЫ

Новы дзень, новыя поспехі, перамогі, калі-нікалі зноў хваляванні. Праўда, універсітэцкая статыстыка настойліва сцвярджае, што колькасць апошніх у гэтую сесію намнога паменшылася.

Цікавыя навіны прыходзяць у рэдакцыю з розных факультэтаў. Многія з іх да зімовых экзаменаў прыйшлі ў поўным саставе. Сярод такіх — геолага-геаграфічны, гістарычны і юрыдычны факультэты.

— Некалькі прайшоўшых экзаменаў, — гаворыць сакратар геафака Ларыса Сарафановіч, — паказалі намнога лепшую падрыхтоўку ў параўнанні з мінулай сесіяй. Гэта сцвярджаюць выкладчыкі, студэнты. Мяркуйце самі. У студэнтаў першага і трэцяга курсаў, якія здавалі экзамен па фізіцы і гісторыі КПСС, вялікая колькасць добрых і выдатных адзнак. Добра адчуваюць сябе самыя старэйшыя — чацвёртакурснікі, хоць экзамены ў іх самыя цяжкія.

Праўда, не зусім гладка ўсё абышлося з экзаменам па вышэйшай матэматыцы на другім курсе ў геолагаў.

Але агульны настрой добры, рабочыя абставіны ў напружанні.

— Нядаўна здалі экзамен па логіцы філосафы другога курса толькі на добра і выдатна!

Некалькі экзаменаў прайшло ў першакурснікаў. Многа новых выдатнікаў папоўнілі лепшыя рады універсітэцкага студэнцтва. Сярод іх А. Алесін, А. Канеўскі, Н. Сінкевіч, А. Труханові́ч.

Сяргей Пятровіч Бекешка, намеснік дэкана юрфака, таксама паведаміў цікавыя навіны:

— Радуюць нас у гэтым годзе першакурснікі. Па гісторыі КПСС атрымалі 37 выдатных адзнак. Многія здаюць экзамены толькі на добра і выдатна. Нядрэнна справіўся з экзаменамі па спецыяльнасці і другі курс. Нездавальняючыя адзнакі, праўда, ёсць, але іх толькі некалькі. Сёння здалі палітэканомію трэцякурснікі гэтага аддзялення. Трэба парадавацца за іх. Пасрэдных адказаў было вельмі мала.

— Наогул сесія праходзіць нядрэнна. Студэнты працуюць самааддана, — падвёў ён вынік.

**З. АЛЯКСАНДРАВА.**

## ПАРАДАВАЛІ АДКАЗАМІ

*Ідзе экзаменацыйная сесія, час, у які яскрава праяўляюцца характэрныя асаблівасці студэнтаў. Ужо па паводзінах перад аўдыторыяй можна ўявіць, хто як падрыхтаваны. Адны яшчэ нешта чытаюць, другія пераканаць у сваіх ведах і спакойна чакаюць.*

*Прайшоў экзамен па гісторыі КПСС у трэцяй групе гісторыкаў. Парадавалі сваімі адказамі Н. Гарошка, О. Коршунава, О. Мудрова, В. Леган і іншыя. Асабліва вызначылася другая група, дзе 13 студэнтаў атрымалі выдатныя адзнакі. Гэта тыя, хто сістэматычна рыхтаваўся і добра адказваў на семінарскіх занятках. Але ёсць і пасрэдныя адказы. Асабліва слаба адказваюць тыя, хто пераведзены з вячэрняга і завочнага факультэтаў. Яно і зразумела. Дазда некаторых прадметаў перашкаджала рэгулярнай падрыхтоўцы і ўплывала на вынікі экзаменаў.*

*— Адказамі гісторыкаў задаволена, — гаворыць экзаменатар кандыдат гістарычных навук, дацэнт І. О. Царук.*

*А наперадзе яшчэ экзамены. Пажадаем жа гісторыкам, каб усе выкладчыкі заставаліся імі задаволеныя.*

*М. АЎСІЕВІЧ,*
*аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі.*

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

## І КАБІНЕТ ТРЫМАЕ СПРАВАЗДАЧУ

**Невялікі ўтульны пакой на чацвёртым паверсе галоўнага корпуса запоўнен людзьмі. Адны чытаюць, другія спрачаюцца, трэція шукаюць нешта ў каталогу... Адным словам, рабочая абстаноўка.**

**Я звяртаюся да загадчыка кабінета Аляксея Фёдаравіча Палікарпава:**

**— Усяго некалькі пытанняў. Аляксей Фёдаравіч, раскажыце, калі ласка, аб рабоце кабінета ў гэтыя напружаныя дні сесіі.**

**— Дні сапраўды напружаныя. Цяпер наш кабінет рэгулярна наведвае каля 65—70 чалавек, студэнты розных факультэтаў і аддзяленняў. Намнога павялічылася кнігавыдача. Кабінет перыядычна папаўняецца літаратурай, часопісамі.**

**Аб навінках расказваюць выстаўкі толькі што атрыманай літаратуры, сістэматычны каталог, у якім ёсць аддзелы газет, часопісаў, работ К. Маркса, Ф. Энгельса і У. І. Леніна, навуковых прац супрацоўнікаў універсітэта і інш.**

**Кабінет у дні сесіі завочнікаў працуе і ў нядзелю. Тут часта праводзяцца кансультацыі для студэнтаў, даюцца адказы на іх пытанні.**

**— Назавіце некаторыя лічбы, звязаныя з работай кабінета палітэканоміі ў навучальным годзе.**

**— У 1968 годзе, напрыклад, наш кабінет наведала каля 4.500 чалавек. Выдадзе-**

(Заканчэнне на 2-й стар.).

**Студэнты падрыхтоўчага факультэта паспяхова здалі залік па курсу «Савецкі Саюз».**

**В'етнамскія юнакі і дзяўчаты паказалі глыбокае веданне курса, правільна арыентаваліся ў складаных пытаннях.**

**НА ЗДЫМКУ: дэкан падрыхтоўчага факультэта кандыдат эканамічных навук М. К. Гарбачоў задаволен адказамі сваіх выхаванцаў. Ля карты — студэнт Лю Конг Бай паказвае граніцы Беларускай рэспублікі.**

Фота **М. Нічыпарэнкі.**



# І КАБІНЕТ ТРЫМАЕ СПРАВАЗДАЧУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

**на каля 6.000 кніг, брашур, часопісаў. Для студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў дадзена звыш 200 бібліяграфічных даведак. Было афармлена некалькі выставак, прысвечаных знамянальным датам. Неаднаразова арганізоўваліся выстаўкі па тэматыцы курса палітэканоміі капіталізму і сацыялізма. За апошні год кабінет папоўніўся 200 кнігамі і брашурамі.**

**— Што вы можаце сказаць аб поспехах студэнтаў, якія працуюць у вашым кабінеце? Карацей, як здаюць яны экзамены?**

**— Аб гэтым лепш пагаварыць з Пятром Усцінавічам Грышановічам, дацэнтам кафедры. Сёння ён прымаў экзамен па палітэканоміі ў трэцякурснікаў.**

**— Поспехі нядрэнныя, — адказвае на нашы пытанні Пётр Усцінавіч. Было сем выдатных адказаў, 12 добрых і толькі некалькі здавальняючых. Праўда, хочацца, каб апошніх зусім не было, але, на жаль... Лепшымі студэнтамі зарэкамендавалі сябе Л. Давыдзенка, А. Вараб'ёў, І. Клімаў, В. Мархоненка і іншыя. І немалыя заслугі ў іх выніках кабінета палітэканоміі. На жаль, яшчэ адчуваецца пэўны недахоп літаратуры, хоць многае ў кабінеце усё ж можна знайсці. Наконт сесіі магу сказаць, што вынікі яе значна лепшыя, чым у мінулым годзе.**

**— Можаце пагутарыць з кім-небудзь з наведвальнікаў кабінета, — парэкамендаваў Аляксей Фёдаравіч Палікарпаў.**

**— Аляксей Аўраменка, — адрэкамендаваўся хлопец з-за першага стала.**

**— Ці задавальняе наведвальнікаў работа кабінета?**

**— У цэлым задавальняе. Падабаюцца чулыя адносіны з боку яго работнікаў. Умовы, у якіх мы працуем, добрыя.**

**— Што вы хочаце пажадаць работнікам у новым годзе?**

**— Больш папаўняць свае паліцы літаратурай. Гэта пажаданне ўсіх, хто займаецца ў кабінеце.**

**Так, для плённай вучобы студэнтаў зроблен яшчэ адзін крок: кабінет палітэканоміі добра абсталяван і укамплектаван. Застаецца толькі не забываць яго адрас: галоўны корпус, чацвёрты паверх.**

**З. ШЭЙНА.**





# У ФОТА АБ'ЕКТЫВЕ — СЕСІЯ

*Кожны зручны для падрыхтоўкі куточак ва універсітэце цяпер не пустуе. Займаюцца не толькі ў чытальных залах, кабінетах, інтэрнацкіх пакоях. Адчуваюць сябе шчаслівчыкамі тыя, хто уладкаваўся ў свабоднай аўдыторыі, а то і на ціхай лесвічнай пляцоўцы або каля шырокага падаконніка. Духам экзаменацыйнай сесіі прасякнута ўсё жыццё універсітэта.*

*Вось як напружана працуюць у кабінеце тэорыі і гісторыі дзяржавы і права студэнты юрыдычнага факультэта (здымак унізе).*



*Другі здымак нашага фотакарэспандэнта М. Нічыпарэнкі адлюстраваў хвалюючы момант здачы экзамена. Уважліва слухае адказ студэнткі другога курса біялагічнага факультэта Н. Савачкінай кандыдат хімічных навук дацэнт В. Ф. Бяляеў. Надзя добра авалодала матэрыялам, поўна адказала на ўсе пытанні і заслужана атрымала выдатную адзнаку на экзамене па арганічнай хіміі.*



*У інтэрнатах*

# КАЛІ ПРАЦА ПА ДУШЫ

**Я не быў у сваім інтэрнаце чатыры месяцы. За гэты час тут змянілася многае, што прыемна мяне уразіла. У інтэрнаце стала святлей, чысцей, утульней. Святлей не толькі таму, што упершыню на калідоры гараць усе лямпачкі, але і таму, што з густам падабраны светлыя фарбы, добра зроблен рамонт, зніклі абшарпаныя кускі лінолеуму. Пры ўваходзе вас сустракаюць дзяжурныя. Ва ўсім адчуваецца сапраўдны парадак і клопат аб тых, хто тут жыве. Прыемна пабыць у ленінскім пакоі. Ён па-мастацку аформлен. Упершыню ў інтэрнаце абсталявана чытальная зала, якая аказалася вельмі да спадобы студэнтам. Пачаў працаваць душ.**

**Усё гэта гаварыла аб вялікай працы, стараннi, уменні, і мне міжволі успомнілася тое, што было ў інтэрнаце да прыходу новага каменданта Надзеі Сяргееўны Удавай. Я падумаў, якія вялікія намаганні тут спатрэбіліся, каб дабіцца такіх поспехаў.**

**Гутару з Надзеяй Сяргееўнай.**

**— Прыступіла да працы у красавіку 1968 года, — гаворыць з прыветлівай усмешкай жанчына. — Непрыглядны выгляд меў тады інтэрнат: цёмныя калідоры, разбітыя шыбы, паламаныя ложкі, неабходнасць рамонту, а тут яшчэ і адсутнасць належнай дысцыпліны сярод студэнтаў і іншае.**

**Усё гэта мне добра знаёма, і таму я згаджаюся з Надзеяй Сяргееўнай, што прыйшла яна «на цаліну».**

**— З чаго пачынала? Са знаёмства са студэнтамі.**

**Надзея Сяргееўна лічыць, што любую справу патрэбна пачынаць з таго, каб пазнаць чалавека: «ключ» да студэнтаў можна знайсці толькі тады, калі добра ведаеш кожнага, яго асаблівасці, запатрабаванні, радасці, гора, стан здароўя і г. д.**

**І я бачу, што Надзея Сяргееўна ўвайшла у вялікую сям'ю студэнтаў не толькі як старэйшы і паважаны таварыш, але і як маці, якая клапатліва да іх адносіцца.**

**Вялікі жыццёвы вопыт і вопыт выхаваўчай працы дазволілі ёй знайсці добры кантакт са студсаветам, абаперціся на студэнцкі актыў.**

**Надзея Сяргееўна гаворыць аб недахопах, а я думаю аб тым, што у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова зроблена многае. І нездарма яму прысуджана першае месца сярод іншых інтэрнатаў. Усё гэта вынік напружанай, клапатлівай працы Н. С. Удавай.**

**Яе можна бачыць у інтэрнаце ў любы час. І мне хочацца сказаць Надзеі Сяргееўне вялікае дзякуй за добрую працу, за любоў і чулыя адносіны да людзей, пажадаць вялікіх поспехаў у яе добрых справах.**

**М. ПІПЧАНКА.**

# БАЛХАШСКІЯ БУДНІ

Хто не зведаў пякучых шалёных стэпавых буранаў, каго не сек распалены пясок, хто не марыў як аб найвялікшым шчасці—аб глытку халоднай прэснай вады, той наўрад ці можа ўявіць сабе засоленыя паўпустынныя стэпы Прыбалхаша. Пабываўшы тут хутка пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі англійскі прамысловец Леслі Уркварт прадказваў мінеральным багаццям Прыбалхаша не менш паўвека глухой невядомасці.

Але ўжо ў пачатку трыццатых гадоў на беразе немнагаводнай бухты Бертыс пачалося будаўніцтва аднаго з буйнейшых у Савецкім Саюзе медзеплавільнага камбіната. Па закліку ЦК ВЛКСМ з розных канцоў краіны сюды прыехалі сотні камсамольцаў. На Прыбалхашбуд партыя накіравала групу вопытных партыйных і гаспадарчых работнікаў. У іх ліку вясной 1935 года прыбыла на будаўніцтва камбіната і В. З. Харужая.

Аб Веры Захараўне Харужай — стойкім камуністце-ленінцу, прывабнейшым чалавеку, яе рэвалюцыйнай барацьбе ў Заходняй Беларусі, самаадданай рабоце ў віцебскім падполлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны напісана ўжо нямала кніг і артыкулаў. Ёй прысвечан мастацкі кінафільм. Аднак ва ўсіх гэтых творах гады, праведзеныя Харужай у Прыбалхашшы, толькі мімаходам упамінаюцца. Між тым тут, на будоўлі, ярка і разнастайна праявіўся яе арганізатарскі талент, уменне апяратыўна і глыбока ўнікаць у любыя пытанні— няхай гэта быт рабочых ці работа ліцейнага цэха, палітычная вучоба або арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва.

13 мая 1935 года Вера Захараўна была зацверджана інструктарам райкома ВКП(б) Прыбалхашбуда. За ёй замацавалі групу партыйных арганізацый, а таксама даручылі весці пытанні культурна-асветніцкай работы і народнай адукацыі ў раёне. Праз некалькі дзён В. Харужая і сакратар раённага камітэта ВЛКСМ І. Волкаў ужо дакладвалі на бюро райкома партыі аб плане і ходзе падрыхтоўкі да дзіцячага свята, прысвечанага заканчэнню заняткаў у школе. Урачыста прайшло яно. На школьных ранішніках лепшым вучням і педагогам былі ўручаны падарункі. Вечарам увесь пасёлак ад малога да вялікага сабраўся на вялікае школьнае свята.

Вера Захараўна займалася арганізацыяй лікбезаў і школ для малапісьменных. У той перыяд ліквідацыя непісьменнасці для партыйнай і камсамольскай арганізацый Прыбалхашбуда была справай першаступеннай важнасці. Барацьба з малапісьменнасцю і непісьменнасцю садзейнічала не толькі росту культурнага ўзроўню будаўнікоў, але і стварала ўмовы для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных рабочых кадраў для будучага камбіната. Для наладжвання паспяховай работы вячэрніх школ і курсаў лікбеза райком партыі стварыў спецыяльную камісію. У склад яе ўвайшла і В. Харужая. Яна падбірала настаўнікаў, адшуквала адпаведныя памяшканні, даставала вучэбныя дапаможнікі і інвентар, вяла вялікую растлумачальную работу на будаўнічых участках, у жылых бараках.

Штодзённа Вера Захараўна паспявала зрабіць столькі, што нават бачыўшыя віды таварышы па рабоце здзіўляліся яе працаздольнасці. Ва ўсёй практычнай дзейнасці яна абапіралася на шырокі актыў. Камсамолія будоўлі з гатоўнасцю бралася за любую прапанаваную Верай Захараўнай справу. Здзіўляюча лёгка знаходзіла яна агульную мову з маладымі настаўнікамі, выпускнікамі вышэйшых тэхнічных вучылішчаў і ўчарашнімі пастухамі, хлопцамі з глухіх таёжных сёл.

Гэта ўменне ў простым абмене думкамі пераканаць чалавека, захапіць яго высакароднымі ідэямі дапамагло Харужай літаральна за некалькі дзён падабраць настаўнікаў для ўсіх груп лікбеза і школ малапісьменных. 26 чэрвеня яна інфармавала бюро райкома партыі аб ходзе ліквідацыі непісьменнасці. Праз 20 дзён зноў дакладвала аб становішчы спраў на гэтым участку. У рашэнні бюро ад 16 ліпеня 1935 года адзначалася, што ў выніку зробленай работы ўдалося ахапіць на будаўніцтве рознымі формамі навучання асноўную масу непісьменных і малапісьменных.

Вера Харужая выконвае масу другіх партыйных даручэнняў: рыхтуе да абмеркавання пытанне аб рабоце паштовага аддзялення, выпускае плакаты, сумесна з групай таварышаў займаецца падрыхтоўкай вытворчай канферэнцыі транспартнікаў, правярае ў многіх партарганізацыях работу са спачуваючымі. На грамадскіх пачатках яна загадвала аддзелам партыйнага жыцця ў газеце «Прыбалхашская праўда», некалькі месяцаў выконвала абавязкі сакратара адной з буйнейшых партарганізацый будаўніцтва.

Справы наплывалі з усіх бакоў. Але Вера Харужая ў сваёй стыхіі. Яна літаральна гарэла на рабоце. Камуністка В. І. Папова, якая

## БЕЛАРУСЬ ЮБІЛЕЙНАЯ

Адкрытая да 50-гадовага юбілею КПБ і БССР выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі Беларусі выклікае вялікае ўражанне і захапленне ў шматлікіх наведвальнікаў—рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі і, вядома, студэнтаў. Той, хто пабываў на выстаўцы з фотаапаратам, не мог не зазняць некаторыя кадры цудоўнага відовішча. Не мог вызваліцца ад спакусы і наш фотакарэспандэнт М. Нічыпарэнка, які сёння прапануе ўвазе чытачоў свае здымкі.





**Усяму свету цяпер вядомы магутныя беларускія аўтамабілі.**



**Цудоўны куток прыроды зачароўвае наведвальнікаў выстаўкі.**



**Савецкая Беларусь выпускае самую навейшую складаную тэхніку.**

Фота М. Нічыпарэнкі.

Студэнцкія рэцэнзіі



# НЕЎМІРУЧЫЯ ТРАДЫЦЫІ

«Аб Леніне-рэвалюцыянеру, Леніне-філосафу, Леніне-палітыку, Леніне-эканамісце напісана шмат цікавых і разнастайных кніг. Але ёсць адна праблема, якая даследавана менш за ўсё. Гэта праблема — Ленін-літаратар, пісьменнік, публіцыст. Філолагі вельмі нерашуча звяртаюцца да творчай лабараторыі Уладзіміра Ільіча, да мовы і стылю яго выдатных публіцыстычных твораў»...

Гэтыя радкі — з новай кнігі выкладчыка нашага універсітэта Міхаіла Яўгеньевіча Цікоцкага «У. І. Ленін і пытанні эстэтыкі публіцыстычнага слова».

Сапраўды, пытанні публіцыстычнага майстэрства Леніна яшчэ мала распрацаваны. І аўтар сканцэнтроўвае сваю ўвагу на асноўных прынцыпах літаратурна-публіцыстычнай дзейнасці У. І. Леніна.

Кнігу М. Цікоцкага ўмоўна можна падзяліць на дзве часткі. У першай аўтар гаворыць пра некаторыя агульныя пытанні тэорыі публіцыстыкі і эстэтыкі публіцыстычнага слова, метадалагічную аснову вывучэння мовы і стылю публіцыстыкі У. І. Леніна.

На шматлікіх прыкладах грунтоўнага аналізу прац многіх даследчыкаў аўтар наводзіць чытача на роздум: як звязаць сэнсавы бок у творы з псіхалагічным, аб'яднаць лагічныя паняцці з вобразным мысленнем; вядзе размову аб тым, што такое прырода публіцыстычных жанраў, вобраз у публіцыстычным творы, індывідуальны стыль публіцыста; што такое мастацкая і «немастацкая» публіцыстыка; гаворыць аб сінтэзе сродкаў, інтэлектуальнага і мастацкага пазнання рэчаіснасці, аб сінтэзе навукова-тэарэтычных і эмацыянальна-вобразных пачаткаў.

Робячы экскурс у гісторыю, пачынаючы з прац антычных філосафаў і прамоўцаў—Сакрата, Дэмасфена, Арыстоцеля, Платона, Цыцэрона, — аўтар паказвае, што публіцыстыка бярэ пачатак у глыбокай старажытнасці і аснова яе—аратарскае майстэрства. Ён падкрэслівае асаблівасці стылю аратарскага публіцыстычнага слова і стылю мастацкага слова, асаблівасці аратарскай мовы і мовы навуковай. Ён выводзіць важную думку, што мэта публіцыста і прамоўцы — не толькі пераканаць слухача, але і раскрыць ісціну, зблізіць навуку і мастацтва з жыццём. Задача публіцыста — арганічна спалучыць у творы вобраз і паняцце.

«У апошні час... — гаворыць аўтар, — многія маладыя нарысісты замест глыбокага пранікнення ў сутнасць апісваемых падзей, у сутнасць таго ці іншага вобразу захапляюцца «мастацкім» апісаннем другарадных падрабязнасцей — пейзажу, партрэта, абстаноўкі — і вельмі мала мысляць. А без думкі, вядома, ніякай публіцыстыкі быць не можа...

Публіцыстыка мае сваю паэзію. Яна — у арганічным адзінстве тэарэтычнага і вобразнага мыслення, у дыялектычнай узаемасувязі і ўзаемадзеяння формы і зместу, слова і думкі, думкі і справы...»

Як жа ўдалося М. Я. Цікоцкаму вызначыць асаблівасці моўнага майстэрства У. І. Леніна і стылістычныя асаблівасці яго публіцыстыкі? Другую частку сваёй кнігі ён разбіў на пяць раздзелаў.

У першым сабраны матэрыялы, якія расказваюць, як Ленін «рашуча змагаўся за адзінства слова і справы, супраць фразёрства і пустаслоўя, без староннягa аб'ектывісцкага апісальніцтва».

Аналізуючы стылістычныя заўвагі на другі праект праграмы партыі, складзены Пляханавым, М. Я. Цікоцкі паказвае, як «разносіць» У. І. Ленін абстрактнасць і цягучасць пляханаўскага выкладання, туманнасць і расплывістасць яго фармулёвак. М. Я. Цікоцкі падкрэслівае на прыкладах актыўныя ленінскія канструкцыі, дакладныя і акрэсленыя вызначэнні. Тут жа характарызуюцца адметныя рысы індывідуальнага стылю Леніна — яго своеасаблівая манера браць у двукоссе словы або цэлыя выразы з мэтай падкрэсліць свае эстэтычныя адносіны да іх, выкарыстоўваць уводныя словы, ужываць цэлую сістэму вобразных метафар і параўнанняў, прынцып свабоды творчай індывідуальнасці, уласны почырк публіцыста.

Другі раздзел прысвечан праблеме тэорыі публіцыстычнага стылю — праблеме ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння лагічнага і вобразнага, рацыянальнага і эмацыянальнага ў публіцыстычных творах. Аналізуючы артыкул «Ад якой спадчыны мы адказваемся», М. Я. Цікоцкі ясна вырысоўвае тэндэнцыйнасць і рэвалюцыйную страснасць Леніна. У гэтым жа раздзеле аўтар прыводзіць прыклады, як уздзейнічала думка Леніна на грамадскую думку, прыклады эмацыянальнасці яго публіцыстычных выступленняў, стылістычнай ролі тону, унутранай сувязі лагічнага і эмацыянальнага.

Прамата, рэзкасць і прынцыповасць палемікі Леніна, трапная ацэнка і простыя тлумачэнні ім складаных праблем рэчаіснасці, пераемнасць стылю дэмакратычнай рускай літаратуры і публіцыстыкі адчуваюцца ў праведзеных даследаваннях М. Я. Цікоцкага. У трэцім раздзеле адлюстраваны погляды Леніна на асаблівасці майстэрства партыйнага агітатара і прапагандыста, выказваюцца думкі, на якога чытача павінна арыентавацца народная публіцыстыка.

Найбольшы інтарэс выклікаюць чацвёрты і пяты раздзелы, дзе гутарка ідзе аб пранікненні ў творчую лабараторыю Леніна-літаратара, аб разуменні сутнасці метадаў яго пісьменніцкай работы над творамі, а таксама аб раскрыцці праблемы ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння слова і вобраза.

Мноства прыкладаў паказвае, як Ленін працаваў над рукапісам, планамі, высвятляе сэнсавыя і эстэтычныя крытэрыі пры стварэнні ім вобразаў-малюнкаў, вобразаў-тыпаў.

Кніга заканчваецца нарысам аб развіцці ленінскіх традыцый у савецкай публіцыстыцы.

Сёння, калі па ўсёй краіне ідзе падрыхтоўка да святкавання 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, калі распачат вялікі творчы паход за настойлівае вывучэнне яго тэарэтычнай спадчыны, гэтая кніга набывае яшчэ большую каштоўнасць.

М. ЦІВА.

# САВЕЦКІ ХАРАКТАР

— Ма-а-ма! Мамачка! Мама! — прарэзлівы, спалоханы дзіцячы крык парушае наступіўшую цішыню. У гэтым крыку і страх, і гора і несуцешная чалавечая боль. Няма нікога. Толькі глыбокая страшная варонка і хлопчык. Бомба, скінутая фашыстамі, вырвала, забрала у адно імгненне яго шчаслівае радаснае дзяцінства.

Не выпадкова я пачынаю гутарку аб фільме «Іван Макаравіч» (вытворчасць кінастудыі «Беларусьфільм», аўтар сцэнарыя Валерый Саўчанка, рэжысёр-пастаноўшчык Ігар Дабралюбаў, аператар Д. Зайцаў) менавіта з гэтага эпізода. Гэта сцэна не можа не хваляваць гледача, не выклікаць роздуму.

Асірацелы хлопчык на незнаёмай станцыі. Як складзецца яго лёс, як ён будзе жыць далей?

Аўтар сцэнарыя, а ўслед за ім рэжысёр выводзяць свайго героя на шырокі жыццёвы шлях. Узмужанне, фарміраванне характару, далейшы лёс Вані раскрыты дастаткова поўна і пераканаўча.

Ваня сустракае добрых простых людзей. Ён акружан цеплынёй і клопатам. Дзядзька Кузя (артыст А. Трусаў), бабуля (артыстка Е. Максімава), суседка (артыстка В. Уладзімірава), уральская дзяўчынка Зіна— усе яны ў любую хвіліну гатовы дапамагчы словам, ласкай, апошнім кавалкам хлеба. У маленькіх, здавалася б, зусім нязначных эпізодах аўтарам удалося не толькі паказаць клопаты аб чалавеку, але і раскрыць шчодры характар савецкага народа.

Гора, агульнае гора, прынесенае вайной, зблізіла людзей. І гэта давала ім сілы дзень і ноч, у тыле і на фронце каваць перамогу.

Такія, як дзядзька Кузя, суседка, хлопчык Ваня, які ўжо ў дзяцінстве стаў Іванам Макаравічам, выстаялі і дапамаглі пераадолець ворага.

Паступова разгортваецца сюжэт кінафільма, і глядач усё больш пранікаецца любоўю да Вані Мацвеева. Хлопчык жыве спачатку ў дзядзькі Кузі, стараецца дапамагчы яму, робіць усё, што ўмее. Відаць, што хлопчык вырас у працавітай сям'і. І хоць бацькі Вані — маці (артыстка Т. Логінава) і бацька (артыст Н. Яроменка) — паказаны вельмі мала, мы ведаем, што гэта яны выхавалі Ваню сумленным, чулым, працавітым.

А вось ён ахвотна дапамагае бабулі і унучцы, якія эвакуіраваліся з Масквы. Глыбока грамадзянскія учынкі, сардэчнасць Вані нас проста захапляюць. Сам яшчэ дзіця, Ваня пакідае у сябе асірацелую маскоўскую дзяўчынку, дапамагае ёй вучыцца, клапоціцца аб ёй.

Задума драматурга раскрываецца і паглыбляецца з дапамогай пранікнёнай ігры артыстаў. У галоўнай ролі зняўся адэскі школьнік Віця Махонін. Ён прыняў лёс свайго мінскага равесніка блізка да сэрца і глыбока перажыў хваляванні і радасці свайго героя. Запамінаюцца і іншыя вобразы простых і сардэчных савецкіх людзей, створаныя другімі акцёрамі.

Фільм «Іван Макаравіч» маладога рэжысёра Ігара Дабралюбава —вялікая творчая ўдача.

Л. ШАБАН,
студэнтка.

Адказны рэдактар
М. І. ІОСЬКА.

АТ 04035. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 85.